**ДУК "Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за люты 2017 г.

## <u>Мерапрыемствы да тыдня роднай мовы</u>

**13 лютага**

У глядзельнай зале Дзівінскага цэнтра культуры і вольнага часу адбыўся творчы вечар-прэзентацыя паэтэсы Надзеі Іванаўны Момлік "Паэзіі святое прызначэнне". Аўтар пазнаёміла прысутных з новымі паэтычнымі творамі, пакінула ўсім жадаючым аўтографы на старонках выдання. Увазе гледачоў арганізавана выстава «Паэзіі святое прызначэнне». Сустрэча суправаджалася відэапрэзентацыяй.

Дзівінскі філіял, 106 чал.

**17 лютага**

На выступленні літаратурна-паэтычнай групы "Ветразь" "Каб бацькоўская мова непаўторнаю кветкай цвіла" прысутныя ўзгадвалі вершы беларускіх паэтаў, словы на беларускай мове, якія ім падабаюцца больш за ўсе, удзельнічалі ў віктарыне "Славутыя імёны Беларусі", слухалі песні на беларускай мове. Відэаролік, прысвечаны папулярызацыі роднай мовы не пакінуў удзельнікаў мерапрыемства абыякавымі.

Арэхаўская ПБ, 26 чал.

**19 лютага**

Навучэнцы Стрыгаўскай СШ сабраліся ў бібліятэцы для ўдзелу ў літаратурнай вечарыне "Сэрцам роднага слова краніся". Увазе гледачоў прадстаўлена літаратурна-музычная кампазіцыя "Вобразная, вольная, пявучая, мова беларуская мая" і цікавыя конкурсныя заданні. Прысутныя прынялі ўдзел у абмеркаванні вядомых твораў пісьменнікаў-юбіляраў і ў чытанні вершаў. Бібліятэкарам арганізавана кніжная выстава "Беларус, роднай мовы сваёй не цурайся".

Стрыгаўская ПБ, 27 чал.

**20 лютага**

Для ўсіх аматараў паэтычнага слова адбылася творчая вечарына мясцовай паэткі Момлік Надзеі Іванаўны "Паэзія, што кранае сэрцы". З задавальненнем прысутныя слухалі гісторыю жыцця і творчасці, вершы і песні. Надзея Іванаўна прэзентавала свой новы зборнік "Арабінавы смак". У адказ удзельнікі сустрэчы выказалі шчырыя словы падзякі за добрыя вершы. Мерапрыемства суправаджалася прэзентацыяй.

Арэхаўская ПБ, 35 чал.

**21 лютага**

На адкрытае пасяджэнне аматарскага клуба "Светоч" у форме літаратурнай гадзіны "Крыніцай звіняць твае словы, мая беларуская мова"

сабраліся навучэнцы сярэдніх класаў СШ №1 г. Кобрына. Кіраўнік клуба Астаповіч Л. І. правяла гутарку аб роднай мове “Любі, шануй, ведай роднае слова”. Члены клуба чыталі вершы пра Беларусь і родную мову, удзельнічалі ў конкурсах: “Канструяванне слоў”, “Аматары беларускага фальклору”, “Пазнай фразеалагізм!”.

Дзіцячы філіял, 52 чал.

**23 лютага**

Для навучэнцаў старэйшых класаў адбылося выступленне літаратурна-паэтычнай групы “Крыніца” з літаратурнай кампазіцыяй “Да роднай мовы зрабі крок”. Прысутныя пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення свята, чыталі вершы на роднай мове. Прынялі ўдзел у конкурсах “Пазнай фразеалагізм”, “Паспрабуй перакласці”. Паказалі вучні і свае пазнанні ў веданні беларускай мовы, прыняўшы ўдзел у віктарыне ”Выток наш і аснова: родная мова”.

Батчынская ПБ, 24 чал.

**23 лютага**

Этнаграфічны калаж “Кола дзён, альбо па старонках народнага календара” сабраў у бібліятэцы гледачоў рознага ўзросту. Увазе прысутных прадстаўлена кніжная выстава “Слова роднае, жывое, гаворкае …”, прапанаваны спіс выданняў беларускіх аўтараў. Бібліятэкар пазнаёміла з народнымі святамі і іх абрадамі, з беларускімі выданнямі-юбілярамі, пісьменнікамі-юбілярамі. На працягу мерапрыемства гучала беларуская мова ў вершах, прыказках, прымаўках, загадках. Прапанавана віктарына “Моўныя скарбы роднага краю”. Самыя актыўныя ўдзельнікі Міхалік Л. І. і Сцепанюк А. С. атрымалі у якасці прызоў льготныя чытацкія білеты на права карыстання дадатковымі паслугамі бібліятэкі.

Шамятоўская ПБ, 28 чал.

**23 лютага**

Сіламі працаўнікоў біблятэкі і Дома культуры арганізавана свята «Жыві, крыніца роднай мовы». Прысутныя пазналі гісторыю свята, праслухалі музычныя нумары, жартоўныя апавяданні. Дзеці прынялі ўдзел у інтэлектуальнай гульне «Слова жывое, гаворкае, роднае», якая ўключала разнастайныя конкурсы: “Мудрыя дарадцы”, “Беларускі каляндар”, “Рыфмоўкі”, “Капітаны”. Усе ўдзельнікі атрымалі прызы, а самыя актыўныя гульцы каманды-пераможніцы - льготныя чытацкія білеты на права карыстання дадатковымі паслугамі бібліятэкі.

Дзівінскі філіял, 63 чал.

**24 лютага**

Супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі сумесна з кінатэатрам “Вясёлка” правялі выязную літаратурную гадзіну ў Буховіцкай сярэдняй школе “Слова жывое, гаворкае, роднае”. Вучні разам з настаўнікамі ўзгадалі гістарычны шлях беларускай мовы, абмяркавалі сучасную беларускую літаратуру, прынялі ўдзел у цікавых заданнях, конкурсах і літаратурнай віктарыне “Прыгарніся да роднага слова”. Мерапрыемства завяршылася праглядам фільмаў “Размова пра мову” і “Якія сны сніць мядзведзь”.

ЦБ, 37 чал.

## Мерапрыемствы з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі

**1 лютага**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры для састарэлых і інвалідаў Кобрынскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната адбылася гадзіна этыкету "Добрым словом друг друга согреем". Госці пазнаёміліся з гісторыяй паходжання этыкету, прынялі актыўны ўдзел у віктарыне "Что такое этикет? Это можно, это нет", прачыталі вершы пра этыкет.

ЦБ, 18 чал.

**14 лютага**

У Дзень Святога Валянціна ў інфармацыйна-сэрвісным цэнтры для падапечных Кобрынскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната адбылася літаратурна-музычная кампазіцыя "Любовью дорожить умейте". Супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі цікавае паведамленне пра гісторыю свята, расказалі пра знакі Дня закаханых і пра тое, як адзначаюць гэтае свята ў розных краінах. У гонар Дня Святога Валянціна госці атрымалі на памяць "валянцінкі". Завяршылася мерапрыемства праглядам фрагмента мультфільма пра каханне "Трыстан і Ізольда".

ЦБ, 26 чал.

**20 лютага**

Для падапечных тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання дзённага знаходжання дзяцей-інвалідаў у інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя "Любви волшебные страницы". Бібліятэкары расказалі пра гісторыю, звычаі, традыцыі свята, паказалі фрагмент мультфільма "Летучий корабль". На памяць госці атрымалі "валянцінкі".

ЦБ, 22 чал.

**22 лютага**

Напярэдадні свята Дня абаронцаў Айчыны прайшоў святочны агеньчык "Вам, сапраўдныя мужчыны!", арганізаваны Кобрынскай раённай арганізацыяй "БелТІЗ". Старшыня арганізацыі Смеховіч Валянціна Мікалаеўна павіншавала мужчын арганізацыі і ўручыла памятныя падарункі. Супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі літаратурна-музычную кампазіцыю "Мужской сегодня день". Прадэманстраваны відэаролік з мастацкага фільма Уладзіміра Рагавога "Офицеры". Бібліятэкар Дзівінскай публічнай бібліятэкі Гурыш Т. А. арганізавала музычнае суправаджэнне і займальныя гульні і конкурсы.

ЦБ, 42 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**3 лютага**

Для сваіх маленькіх чытачоў, навучэнцаў 1 - 2 класаў, бібліятэкар правяла гадзіну знаёмстваў "Нам с книгой назначена встреча". Падчас мерапрыемства дзеці пазнаёміліся з бібліятэкай, з гісторыяй стварэння кніг і правіламі абыходжання з імі. Маленькія наведвальнікі ўспаміналі

тэматычныя прыказкі і прымаўкі, прымалі актыўны ўдзел у віктарыне “По страницам любимых книг”.

Акцябрская ПБ, 17 чал.

**3 лютага**

Бібліятэчны ўрок “Книжки разные нужны, книжки разные важны” адбыўся для навучэнцаў 1 - 2 класаў Буховіцкай СШ. Дзеці пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення кнігі, узялі ўдзел у віктарыне і пазнавальнай гульне “Пытанні на засыпанне”, прагледзелі відэапрэзентацыю “Дзіцячыя кнігі - юбіляры 2017года”.

Буховіцкая ПБ, 16 чал.

**10 лютага**

Казачныя героі сустрэлі навучэнцаў пачатковай школы ў час прысвячэнні ў чытачы «Открывая книгу – открываешь мир». Дзеці слухалі пра бібліятэку і пра правілы паводзін у ёй, адказвалі на пытанні займальнай віктарыны, чыталі вершы і прымалі ўдзел у рухомых гульнях, знаёміліся з кніжнай выставай « Разноцветье сказок».

Батчынская ПБ, 24 чал.

**14 лютага**

Гадзіна беларускай гісторыі “Шлях да бацькаўшчыны Напалеона Орды” прайшла для старшакласнікаў Лукскай СШ. Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з Напалеонам Ордай, расказала аб яго жыцці і дзейнасці, які след пакінуў гэты чалавек у гісторыі края, аб яго мастацкай і музычнай спадчыне. Расказ суправаджаўся паказам відэапрэзентацыі “Шляхамі Напалеона Орды”.

Лукская ПБ, 25 чал.

**16 лютага**

У інфармацыйна - сэрвісным цэнтры бібліятэкі для навучэнцаў СШ №1 прайшоў урок мужнасці “Жывая памяць”, прысвечаны Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. Расказана пра беларускіх воінаў-інтэрнацыяналістаў, паказаны дакументальны ролік “Солдаты необъявленной войны”. Успамінамі пра афганскія падзеі і свой удзел у вайне падзяліўся падпалкоўнік, намеснік камандзіра асобнага батальёна аховы ў Афганістане Андраюк Іосіф Браніслававіч.

ЦБ, 68 чал.

**27 лютага**

Члены аматарскага клубу "Терница" правялі пазнавальна-забаўляльную праграму "Масленица в гостях у самовара". Удзельнікі пазнаёміліся з гісторыяй свята праводзінаў зімы, прымалі ўдзел у конкурснай праграме "Масленица идёт, блин да мёд несёт". Апроч гэтага дзеці сталі ўдзельнікамі

фальклорнага свята "Масленичные погулянки", які праходзіў у Стрыгаўскім Цэнтры культуры і вольнага часу.

Стрыгаўская ПБ, 17 чал.

**27 лютага**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры адбыўся чарговы турнір па інтэлектуальных гульнях "Кобринские игры эрудитов" – "Золотой возраст". Турнір сабраў 5 каманд: "Надежда", "Роза ветров", "Роза ветров – 2", "Старики-разбойники" і "Бригантина". У напружаным змаганні ў гульні "Что? Где? Когда?" прызавыя месцы занялі: каманда "Надежда" (1 месца), "Роза ветров" (2 месца), "Роза ветров – 2" (3 месца).

ЦБ, 67 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81